# *§ 20–0. Развіццё культуры Беларусі ў XIX — пачатку XX ст.

ВІНЦЭНТ ДУНІН-МАРЦІНКЕВІЧ
МАРК ШАГАЛ ЯЎХІМ КАРСКІ
НАПАЛЕОН ОРДА
ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ
ЯНКА КУПАЛА ЯКУБ КОЛАС
ІГНАТ БУЙНІЦКІ
НІКАДЗІМ СІЛІВАНОВІЧ
АЛАІЗА ПАШКЕВІЧ
ТЭХНІЧНЫ ПРАГРЭС

**1. Прамысловая рэвалюцыя і тэхнічны прагрэс. Уплыў прамысловай рэвалюцыі на развіццё культуры.** Вынаходства паравога рухавіка ў канцы XVIII ст. і пераход да фабрычнай вытворчасці спрыялі тэхнічнаму прагрэсу ў прамысловасці. Разнастайныя новаўвядзенні ў металургіі, выкарыстанне электрычнасці і з'яўленне хімічнай прамысловасці ў XIX ст. паклалі пачатак новаму этапу ў развіцці тэхнікі. Яго адметнаю рысай была вытворчасць машын пры дапамозе іншых машын. Тэхнічны прагрэс прывёў да вялікіх змен у жыцці еўрапейскага грамадства.

Уплыў прамысловай рэвалюцыі на развіццё культуры

Машыны зрабіліся часткай паўсядзённага жыцця людзей і аказалі ўплыў на іх лад жыцця, на духоўную і матэрыяльную культуру. Патрэбы гандлю і фабрычна-заводскай прамысловасці выклікалі сапраўдны пераварот у развіцці сродкаў транспарту і сувязі.

Як змяніў жыццё людзей тэхнічны прагрэс?

Навуковыя адкрыцці XIX ст. адыгралі велізарную ролю ў развіцці культуры. Аднак індустрыялізацыя выклікала шмат новых праблем. Па меры ўскладнення сацыяльнага быцця і паскарэння

жыццёвых рытмаў у людзей з’явілася адчуванне страты трываласці і стабільнасці. Пашыраліся песімістычныя настроі, ідэалізацыя мінулага і непрыняцце ўсяго новага. Гэта паслужыла пажыўным асяроддзем для ірацыяналізму, містыкі, нявер’я ў прагрэс. Адначасова з гэтым поспехі ў галіне навукі, тэхнікі і матэрыяльнай вытворчасці стваралі падставы для аптымізму, веры ў магчымасць вырашэння ўсіх пытанняў з дапамогай навукі і розуму.

**2. Новыя з’явы ў культуры. Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці літаратуры і мастацтва.** Супярэчнасці XIX ст. знайшлі свой адбітак і ў мастацкай культуры. Найбольш поўна яны былі выказаныя ў літаратуры.

### Рамантызм

Спачатку мастацкая культура развівалася пад уплывам Французскай рэвалюцыі, а пасля ва ўмовах фарміравання індустрыяльнага свету і буржуазнага грамадства. Своеасаблівай творчай рэакцыяй на гэтыя працэсы выступіў *рамантызм*, які склаўся напрыканцы XVIII ст. амаль адначасова ў Германіі, Англіі, Францыі і Расіі.

У аснове рамантызму знаходзіцца ўяўленне аб супрацьстаянні двух сусветаў — ідэальнага і рэальнага. Для рамантыкаў ідэал — гэта нешта цудоўнае і дасканалае, але ў той жа час таямнічае, недасяжнае і неспасціжнае для розуму. Рэчаіснасць, наадварот, канкрэтная, нізкая і агідная. Паміж ёй і ідэалам — неперасяжная прорва.

Як выяўлена мэта мастацтва ў выказванні славутай французскай пісьменніцы?

„Мастацтва не ёсць выява рэальнай рэчаіснасці, а шуканне ідэальнай праўды“.



Аўрора Дзюпэн
(літаратурны псеўданім — Жорж Санд),
французская пісьменніца

У сваім творы «Чалавечая камедыя» — самым значным дасягненні еўрапейскага рэалізму — Анарэ дэ Бальзак падкрэсліваў, што ў грамадстве заўсёды будуць існаваць розныя віды, таксама як яны існуюць у жывёльным царстве.

Анарэ дэ Бальзак,
французскі пісьменнік



Ці згодныя вы з думкай Анарэ дэ Бальзака?

**Рэалізм**

У 1830–1840-я гг. на змену рамантызму прыходзіць іншы кірунак у мастацтве XIX ст. — *рэалізм*. Прадстаўнікі рамантызму апісвалі выключныя характары ў выключных абставінах, а рэалізму — тыповыя характары ў тыповых абставінах. Такімі абставінамі для рэалістаў былі перш за ўсё сацыяльныя ўмовы. Яшчэ адной важнай адметнасцю рэалістычнага мастацтва быў крытычны паказ недахопаў і болевых пунктаў сучаснага яму грамадства.

**Сімвалізм**

*Сімвалізм* — адна з найбольш устойлівых плыняў у мастацтве і літаратуры Заходняй Еўропы напрыканцы XIX ст. Яго прызнаным лідарам быў *Стэфан Малармэ*. Галоўная каштоўнасць для сімвалістаў — непазнанае, якое хаваецца як у самім чалавеку, так і ў навакольным свеце. Яго немагчыма растлумачыць з пазіцый розуму, а можна выявіць толькі ў туманных сімвалах — знаках і вобразах. Сімвалісты былі перакананыя ў нікчэмнасці розуму.



**Лебедзь** (1885 г.)

О, лебедзь даўніх дзён, ты помніш: гэта ты,
Ды марна, велічны, змагаешся з пустэльняй:
Ўжо бліскае зімы халоднае вяселле,
І мары не ўзвялі краінаў пекнаты.

Стэфан Малармэ,
французскі паэт

Паразважайце, што хацеў перадаць паэт вобразам лебедзя.



## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Збавіцельны храм Святога Сямейства — царква ў Барселоне (Іспанія), якая будуецца з 1882 г. У 1883 г. аўтарам праекту зрабіўся Антоніа Гаўдзі.

Паводле слоў самога архітэктара, ён браў узоры архітэктурных формаў «у звычайным дрэве, з яго голлем і лістамі. Усе часткі дрэва растуць арганічна і здаюцца цудам, бо стварыў іх адзін мастак — Бог».

Скончыць будаўніцтва храма плануецца не раней за 2026 г.

### Мадэрн

Пад уплывам сімвалізму ў еўрапейскім і амерыканскім мастацтве канца XIX — пачатку XX ст. склаўся мастацкі стыль *мадэрн*. Аснову мадэрну складала ідэя сінтэзу розных мастацтваў. Як ідэал такога сінтэзу разглядалася архітэктура. Невыпадкова наватарамі ў галіне мадэрну выступілі архітэктары — *Віктор Орта* і *Анры ван дэ Вельдэ* ў Бельгіі і *Антоніа Гаўдзі* ў Іспаніі.

### Авангарднае мастацтва

Пачатак XX ст. характарызуецца актыўным пераглядам класічных традыцый у мастацтве. З'явілася вялікая колькасць кірункаў, якія вылучаліся імкненнем да новых рашэнняў у рэалізацыі творчых ідэй. Амаль усе новыя кірункі насілі нязвыклыя, а часам і экзатычныя назвы: *футурызм, сюрэалізм, абстракцыянізм, экспрэсіянізм, кубізм, супрэматызм, фавізм, дадаізм* і г. д. Пазней сукупнасць гэтых мастацкіх кірункаў пачалі называць *авангардным мастацтвам*.

### Футурызм

Авангарднае мастацтва адкідала рэалізм і намагалася стварыць новы стыль у мастацкай культуры. Гэтай скіраванасцю ў найбольшай ступені вылучаўся *футурызм*. Футурысты апявалі век тэхнікі і гарадской цывілізацыі. Яны адмаўлялі выяўленне

**Таварышу Нетэ, параходу і чалавеку** (1926 г.)

Ў нашых жылах —
кроў, а не вадзіца.
Рушым цераз
куляў перасвіст,
каб
і пасля смерці,
пераліцца
ў параходы,
вершы
і падобную карысць.



Уладзімір Маякоўскі, паэт

вясковых матываў як увасабленне застою ў мастацтве. Футурысты прысвяцілі сваю творчасць гораду, у якім бачылі правобраз будучыні. Для футурыстаў асоба не мела каштоўнасці сама па сабе, яна паслядоўна растваралася ў дзяржаве і тэхніцы, і ўсё разам — у руху.

Натуральна, духоўнае жыццё Еўропы на зломе стагоддзяў нельга зводзіць толькі да авангарднага мастацтва. Імкненне да рэалістычнай творчасці і арыентацыя на агульначалавечыя каштоўнасці былі па-ранейшаму характэрныя для многіх пісьменнікаў таго часу — такіх, як *Анатоль Франс, Джордж Бернард Шоу, Генрых Ман*.

**3. Польскі і расійскі ўплыў. Народная і шляхецкая культура.** Адметнасцю развіцця культуры Беларусі ў XIX ст. было тое, што яна зазнала як польскі, так і расійскі ўплыў.

Асаблівасці развіцця культуры Беларусі

Шляхецкая культура ў Беларусі да паўстання 1830–1831 гг. развівалася пераважна пад польскім уплывам. Значная частка шляхты прытрымлівалася каталіцкіх традыцый, якія ў той час асацыяваліся з Польшчай. Пасля паўстання 1830–1831 гг. актывізаваліся працэсы дэпаланізацыі, узмацніўся рускі ўплыў. Руская мова зрабілася мовай навучання, справаводства. Пашырэнне праваслаўя пацяг-



## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі і веды з беларускай і рускай літаратуры, даведайцеся, хто з беларускіх і рускіх паэтаў ХІХ — пачатку ХХ ст. былі сучаснікамі, былі знаёмымі, сябравалі.

Падрыхтуйце прэзентацыю (буклет, постар) на тэму «Паэзія аб’ядноўвае душы і народы».

нула за сабой умацаванне традыцый рускай школы ў архітэктуры і жывапісе. Пасля закрыцця Віленскага ўніверсітэта ўраджэнцы Беларусі ехалі атрымліваць вышэйшую адукацыю ва ўніверсітэты Пецярбурга, Масквы і іншых гарадоў Расійскай імперыі.

Носьбітам беларускіх традыцый і мовы было сялянства. Менавіта ў сялянскім вясковым асяроддзі захоўвалася беларуская мова, развіваліся народныя традыцыі і абрады, традыцыйная беларуская кухня, адметныя асаблівасці нацыянальнага строю.

**4. Культура нацыянальных меншасцей.** Адной з адметнасцей нацыянальна-культурнага становішча Беларусі было пражыванне на нашай тэрыторыі прадстаўнікоў іншых народаў і рэлігій. Менавіта на тэрыторыі Беларусі яны мелі магчымасць захоўваць і развіваць свае культурна-рэлігійныя і этнічныя рысы. Ад часоў Вялікага Княства Літоўскага тут жылі яўрэі, татары, рускія, палякі, украінцы, літоўцы, латышы, цыганы і інш.

**Яўрэі ў Беларусі**

Нацыянальныя меншасці на тэрыторыі Беларусі захоўвалі сваю культуру і рэлігію. Прадстаўнікі яўрэйскага насельніцтва вызнавалі іўдаізм. Ім было дазволена будаваць сінагогі. Мовай іх зносін

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Мячэць у Іўі пабудавалі ў 1882 г. на сродкі графіні Эльвіры Замойскай, уладальніцы мястэчка. У 1922 г. былі дабудаваныя галерэя і мінарэт з высокім шпілем.

Мячэць ніколі не закрывалася. У гады СССР яна была адзіным мусульманскім храмам, які дзейнічаў на тэрыторыі Беларусі.

У 2002 г. было прынята рашэнне аб унясенні мячэці ў Іўі ў Дзяржаўны спіс гістарычна-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

*Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы, знайдзіце, якія аб’екты вашага населенага пункта занесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.*



быў ідыш. Яўрэі былі добрымі рамеснікамі. У канцы XIX ст. менавіта з яўрэйскага асяродку выйшлі славутыя мастакі Юдаль Пэн, Марк Шагал, Хаім Суцін і інш.

**Татары ў Беларусі**

Татары жылі пераважна на захадзе і паўночным захадзе Беларусі. Іх рэлігіяй быў іслам. Адна з найбуйнейшых татарскіх абшчын знаходзілася ў Іўі. Менавіта там напрыканцы XIX ст. была пабудаваная мячэць, якая сёння лічыцца помнікам беларускага драўлянага дойлідства. Характэрнай адметнасцю татарскай культуры на тэрыторыі Беларусі былі кітабы. Гэта кнігі, напісаныя на беларускай мове арабскім пісьмом.

**5. Станаўленне новай беларускай літаратуры і літаратурнай мовы.** XIX ст. з’яўляецца часам станаўлення новай беларускай літаратуры і літаратурнай беларускай мовы.

**Аснова — сялянская мова**

Успомніце, якую ролю адыгрывала старабеларуская мова ў Вялікім Княстве Літоўскім.

Новая беларуская літаратура — гэта літаратурныя творы, напісаныя на беларускай мове, да якой пачалі часцей звяртацца ў XIX ст.






## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

У 1820-я гг. на беларускай мове Вікенціем Равінскім была напісаная паэма «Энеіда навыварат» (доўгі час лічылася ананімнай). Упершыню надрукавана ў 1845 г.

У 1855 г. Канстанцін Вераніцын піша паэму «Тарас на Парнасе», якая з'явілася ў друкаваным выглядзе ў 1889 г. і таксама працяглы час лічылася ананімнай.

У творах героямі з'яўляюцца простыя беларускія сяляне.

*Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся:*

- *біяграфіі аўтараў першых беларускамоўных паэм;*
- *чаму гэтыя творы доўгі час лічыліся ананімнымі і як было выяўлена аўтарства.*

У 1846 г. пабачыла свет друкаваная версія камедыі Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча «Ідылія», у якой сялянскія персанажы гаварылі на беларускай мове. У гэты ж час Ян Баршчэўскі выдаў кнігу «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях».

Францішак Багушэвіч

Важны этап у фарміраванні беларускай літаратурнай мовы — творчасць Францішка Багушэвіча. Напрыканцы XIX ст. Ф. Багушэвіч выдаў два паэтычныя зборнікі на беларускай мове — «Дудка беларуская» і «Смык беларускі». Вялікую ўвагу ў сваіх творах Францішак Багушэвіч надаваў беларускаму селяніну і беларускай мове.

Алаіза Пашкевіч

У працяг гэтых традыцый напачатку XX ст. Алаіза Пашкевіч (Цётка) адзін са сваіх паэтычных зборнікаў на беларускай мове назвала «Скрыпка беларуская».

У пачатку XX ст. пачынаюць свой творчы шлях класікі беларускай літаратуры Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч. У гэты час з'яўляюцца

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры пачаў работу ў 1991 г. у некалькіх будынках Траецкага прадмесця ў Мінску. За гады яго існавання было адкрыта дзевяць філіялаў, якія знаёмяць наведвальнікаў з багатым сусветам беларускай літаратуры.

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, якія філіялы былі адкрыты. Дзе яны знаходзяцца? Творчасці якіх беларускіх пісьменнікаў прысвечаны?*
2. *Выкарыстоўваючы веды, засвоеныя на ўроках беларускай літаратуры, прывядзіце прыклады твораў беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, у якіх паказанае жыццё беларускага народа ў XIX — пачатку XX ст.*



*Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры*

першыя вучэбныя выданні на беларускай мове — «Першае чытанне для дзетак беларусаў» і «Другое чытанне для дзяцей беларусаў».

**6. Адукацыя і навука.** XIX ст. было часам імклівага развіцця адукацыі і навукі ў Беларусі. У гэты час на тэрыторыі Беларусі былі праведзены рэформы ў галіне адукацыі. Пашыралася магчымасць атрымаць адукацыю для прадстаўнікоў усіх саслоўяў.

**Рэформа адукацыі пачатку XIX ст.**

Напачатку XIX ст. тэрыторыя Беларусі ўвайшла ў склад Віленскай вучэбнай акругі, цэнтрам якой быў Віленскі ўніверсітэт. Прадстаўнікі ніжэйшых саслоўяў атрымалі доступ толькі да пачатковай адукацыі. Сярэднюю адукацыю можна было атрымаць у класічных 7-класных гімназіях і павятовых 4-класных вучылішчах, а таксама ва ўніяцкіх і каталіцкіх калегіумах. Вышэйшую адукацыю давалі Віленскі ўніверсітэт і Полацкая езуіцкая акадэмія (да 1812 г. — Полацкі езуіцкі калегіум).

Што сведчыць аб тым, што адукацыя ў першай палове XIX ст. мела саслоўны характар?

### Змены пасля паўстанняў 1830–1831 і 1863–1864 гг.



*Горы-Горацкі земляробчы інстытут. Мастак Н. Орда. XIX ст.*

Параўнайце сістэму адукацыі ў XIX — пачатку XX ст. і ў сучаснай Рэспубліцы Беларусь. Вызначыце асноўныя падабенствы і адрозненні.

Сітуацыя змянілася пасля падзей 1830–1831 гг. Віленскі ўніверсітэт быў закрыты. На тэрыторыі Беларусі не засталося вышэйшых навучальных устаноў (яшчэ ў 1820 г. пасля забароны ордэна езуітаў у Расійскай імперыі была закрытая Полацкая езуіцкая акадэмія). У 1848 г. Горы-Горацкую земляробчую школу рэарганізавалі ў інстытут, які праіснаваў да 1864 г. Школа зрабілася першай вышэйшай навучальнай установай сельскагаспадарчага профілю на тэрыторыі Расійскай імперыі. Мовай навучання робіцца руская мова.

У 1864 г. была праведзена школьная рэформа. Адукацыя зрабілася ўсесаслоўнай і пераемнай. Пачатковую адукацыю давалі пачатковыя народныя вучылішчы, школы граматы, царкоўна-прыходскія школы ў вёсках і гарадскія вучылішчы, павятовыя вучылішчы, прыходскія вучылішчы ў гарадах. Сярэднюю адукацыю па-ранейшаму можна было атрымаць у класічных гімназіях (гуманітарны профіль) і рэальных вучылішчах (матэматычны і прыродазнаўчанавуковы профіль). Будучых вайскоўцаў рыхтавалі ў кадэцкіх карпусах (Полацк, Брэст). Вышэйшую адукацыю давалі ўніверсітэты і іншыя вышэйшыя ўстановы, але на тэрыторыі Беларусі пасля 1864 г. такіх устаноў не было. Вышэйшую адукацыю ўраджэнцы Беларусі маглі атрымаць ва ўніверсітэтах Расійскай імперыі або за мяжой.

### Прафесійныя навучальныя ўстановы

У пачатку XX ст. працягвала развівацца сетка прафесійных навучальных устаноў. Адкрываліся гандлёвыя, рамесныя, музычныя, медыцынскія, мастацкія і іншыя навучальныя ўстановы. У Маладзечне ад 1864 г. дзейнічала першая ў Расійскай імперыі настаўніцкая семінарыя па падрыхтоўцы настаўнікаў пачатковых школ.

### Пачатак навуковага даследавання Беларусі

XIX ст. — час станаўлення і развіцця беларусазнаўства. Развіваюцца этнаграфія і фалькларыстыка, расце цікавасць да гісторыі і культуры беларускага народа.

Адбываецца станаўленне і развіццё навуковага даследавання Беларусі. Вынікам падарожжа Паўла Шпілеўскага была кніга «Падарожжа па Палессі і беларускім краі». Беларускі фальклор вывучаў Ян Чачот. Стваральнікамі першых гістарычных музеяў з’яўляюцца браты Канстанцін і Яўстах Тышкевічы. Асаблівасці мовы ў «Слоўніку беларускай гаворкі» адлюстраваў Іван Насовіч.

Першымі беларускімі гісторыкамі лічацца Мітрафан Доўнар-Запольскі і Вацлаў Ластоўскі. «Кароткая гісторыя Беларусі» апошняга — першая праца па гісторыі на беларускай мове. Напачатку XX ст. Яўхім Карскі працаваў над фундаментальным трохтомным даследаваннем «Беларусы». Менавіта ў ім была прыведзена карта этнаграфічнага рассялення нашых продкаў.

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце прэзентацыю аб вучоных, якія зрабілі ўнёсак у навуковае вывучэнне Беларусі, развіццё навукі.

Значны ўнёсак ураджэнцы Беларусі зрабілі ў развіццё дакладных і прыродазнаўчых навук. Ігнат Дамейка быў славутым геолагам, большую частку жыцця правёў у Чылі, дзе зрабіўся нацыянальным героем. Ян (Іван) Чэрскі — буйны вучоны-географ, геолаг, знакаміты даследчык Сібіры, імем якога названы шэраг геаграфічных аб’ектаў. Мікалай Судзілоўскі — этнограф, географ, хімік, біёлаг, урач-генетык, першы прэзідэнт сената Гавайскіх астравоў. Якуб Наркевіч-Ёдка даследаваў атмасферную электрычнасць, вынайшаў громаадвод і тэлеграф. Соф’я Кавалеўская — першая ў свеце жанчына — прафесар матэматыкі. Варвара Кашаварава-Руднева — першая ў Расіі жанчына — доктар медыцыны. Ганна Тумаркіна — першая ў Еўропе жанчына — прафесар філасофіі.

**7. Перыядычны друк.** Перыядычны друк на тэрыторыі Беларусі ў XIX — пачатку XX ст. не быў прадстаўлены шырокай сеткай і разнастайнасцю выданняў. Разам з тым гэта быў перыяд з’яўлення першых легальных, афіцыйных, нацыянальных,

Як вы лічыце, чаму газеты і часопісы ў XIX — пачатку XX ст. былі цэнтрамі культурнага жыцця?

беларускамоўных перыядычных выданняў. Менавіта газеты і часопісы часцяком выступалі як своеасаблівыя цэнтры, вакол якіх кансалідавалася культурнае жыццё і грамадская думка Беларусі таго часу.

**Афіцыйны перыядычны друк**

Найбольш пашыранай была афіцыйная дзяржаўная і царкоўная перыёдыка — «Губернскія ведамасці» і «Епархіяльныя ведамасці», якія насілі пераважна інфармацыйны характар. У кожнай губерніі і епархіі Беларусі былі свае «ведамасці».

Выкажыце здагадкі, пра што маглі пісаць у «Ведамасцях» вашай губерні 125 гадоў таму.

У другой палове XIX ст. ўсё большую папулярнасць набывалі навуковыя і навукова-папулярныя выданні, выданні гісторыка-літаратурнага, этнаграфічнага характару. Першы ў Расійскай імперыі навуковы фізіка-матэматычны часопіс выходзіў у Вільні ў 1860–1863 гг. Адным з яго стваральнікаў быў Караль Чаховіч. У Вільні таксама выходзіў «Веснік Заходняй Расіі», дзе публікаваліся гістарычныя, этнаграфічныя даследаванні, мастацкія і публіцыстычныя творы. У «Весніку» змяшчаліся ўнікальныя матэрыялы па гісторыі Беларусі, у тым ліку перыяду ВКЛ.

**«Віленскі веснік»**


Четвергъ. 3-го іюля 1897 г.

ВИЛЕНСКІЙ ВѢСТНИКЪ

ГАЗЕТА ЛИТЕРАТУРНАЯ и ПОЛИТИЧЕСКАЯ.

Выходитъ ежедневно, кромѣ дней послѣпраздничныхъ.

КОНЦЕРТНЫЙ ЗАЛЪ ВЪ „БОТАНИЧЕСКОМЪ САДУ“.

Сегодня въ четвергъ 3-го іюля 1897 года

СЕАНСЫ ВСЕМІРНО-ИЗВѢСТНАГО НАСТОЯЩАГО

СИНЕМАТОГРАФА ЛЮМЬЕРА.

...картины Св. Коронованія Ихъ Императорскихъ Величествъ 14 мая 1896 г. въ Москвѣ.

Начало сеансовъ въ 8½ час. Оканчиваются около 11 час. вечера.

...продолжается на второе полу-

Столѣтіе виленской казенной палаты

Папулярнасцю сярод адукаванага насельніцтва карысталася газета «Віленскі веснік», адным з выдаўцоў і рэдактараў якой быў Адам Кіркор. Газета складалася з афіцыйнай (дакументы афіцыйнага справаводства, указы, пастановы, распараджэнні ўлад і да т. п.) і неафіцыйнай (літаратурныя творы, этнаграфічныя і гістарычныя нарысы, публіцыстычныя артыкулы і да т. п.) частак. Першапачаткова газета выходзіла на рускай і польскай мовах, а ад 1864 г. — толькі на рускай. У «Віленскім весніку» друкаваліся Уладзіслаў Сыракомля, Тэадор Нарбут, браты Канстанцін і Яўстах Тышкевічы, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Мітрафан Доўнар-Запольскі, Яўхім Карскі і інш.

Назавіце творы літаратуры, напісаныя гэтымі аўтарамі.

У 1884 г. у Пецярбургу выйшлі два нумары нелегальнага перыядычнага выдання на беларускай мове — народніцкага часопіса «Гоман». Менавіта на яго старонках упершыню прагучала ідэя аб самастойнасці беларускай нацыі.

Значнай падзеяй у развіцці публіцыстыкі Беларусі таго часу было з'яўленне ў Мінску ў 1886 г. першай прыватнай газеты — «Мінскі лісток». Выданне прытрымлівалася ліберальна-патрыятычных пазіцый і насіла асветніцкі, літаратурна-культурны і гісторыка-этнаграфічны характар.

«Мінскі лісток»


№ 48. МИНСКІЙ ЛИСТОКЪ № 48.

ОБЩЕСТВЕННО-ЛИТЕРАТУРНАЯ ГАЗЕТА

ОТКРЫТА ПОДПИСКА НА ГАЗЕТУ „МИНСКІЙ ЛИСТОКЪ"

ТЕЛЕГРАММЫ

У канцы XIX — пачатку XX ст. у сувязі з актывізацыяй грамадска-палітычнай барацьбы, з'яўленнем палітычных партый і арганізацый значна вырасла колькасць перыядычных выданняў, якія адлюстроўвалі іх ідэі і праграмныя ўстаноўкі («Паўночна-заходняе слова», «Ускраіна», «Селянін», «Беларускі веснік», «Паўночна-заходняе жыццё» і інш.). У гэты час развіваецца рэгіянальная перыёдыка, якая адлюстроўвае актуальныя пытанні жыцця гарадоў і паветаў («Лідскае слова», «Бабруйскае жыццё» і інш.). Да пачатку Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі выходзіла больш за 100 газет і часопісаў, у тым ліку на польскай, яўрэйскай, літоўскай мовах. Сярод іх — 3 беларускамоўныя выданні.

Першым легальным перыядычным выданнем на беларускай мове была газета «Наша доля». Яна выходзіла ў Вільні ад верасня да снежня 1906 г. Пасля выхаду шостага нумара выданне газеты было спынена, пяць з шасці нумароў канфіскаваны.

«Наша доля»


№ 1.

Наша Доля

першая беларуская газета для вёскового и местового рабочаго народу.

Наш палетак.

Ад 1906 да 1915 г. у Вільні выходзіла штотыднёвая газета «Наша ніва», якая на доўгі час зрабілася цэнтрам беларускага нацыянальнага руху. Заснавальнікамі выдання былі браты Антон і Іван Луцкевічы, Алаіза Пашкевіч (Цётка), Аляксандр Уласаў. Газета мела шырокую карэспандэнцкую

«Наша ніва»

сетку ў розных рэгіёнах Беларусі і за яе межамі. Тэматыка публікацый была вельмі разнастайная. Асвятляліся актуальныя аспекты грамадска-палітычнага і эканамічнага жыцця, гісторыя і культура, закраналіся сацыяльныя, этнаканфесійныя і шмат якія іншыя пытанні.

Жывапіс

**8. Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці мастацтва.** У мастацтве Беларусі на працягу XIX — пачатку XX ст. мяняліся стылі і кірункі. Для выяўленчага мастацтва пачатку XIX ст. быў характэрны рамантызм, які ў сярэдзіне XIX ст. змяніўся рэалізмам. Напачатку XX ст. жывапіс зазнае ўплыў мадэрну, авангардызму.



*В. Ваньковіч. Эцюд да партрэта А. С. Пушкіна. 1828 г.*

Прадстаўніком рамантызму ў партрэтным жывапісе быў Валенцій Ваньковіч («Міцкевіч на скале Аю-Даг», эцюд да партрэта А. С. Пушкіна). Майстрам нацюрморта з'яўляўся Іван Хруцкі («Кветкі і садавіна», «Партрэт невядомай з кветкамі і садавіной»).

Апалінарый Гараўскі — прадстаўнік акадэмічнага рамантызму. У сваіх работах адлюстроўваў беларускую прыроду («На радзіме», «Вечар у Мінскай губерні»).



*Ю. Пэн. Гадзіншчык. 1914 г.*



*Н. Сіліdevановіч. Жаўнер з хлопчыкам. 1866 г.*

Рэалізм паўсядзённага сялянскага побыту адлюстроўвалі работы Нікадзіма Сілівановіча («Жаўнер з хлопчыкам», «Стары пастух»), Фердынанда Рушчыца («Зямля»). Н. Сілівановіч лічыцца адным з першых беларускіх мазаістаў. Ён атрымаў званне акадэміка жывапісу за мазаіку «Тайная вячэра» для Ісакіеўскага сабора ў Санкт-Пецярбурзе. Славутым беларускім пейзажыстам пачатку XX ст. з’яўляецца Вітольд Бялыніцкі-Біруля («Ранняй вясной», «Зімовы сон»). Замалёўкамі архітэктурных помнікаў і сядзіб Беларусі вядомы Напалеон Орда.

Знайдзіце выявы пералічаных у тэксце палотнаў. Якія з іх падабаюцца вам больш за ўсё? Чаму?

У канцы XIX ст. у Віцебску Юдаль Пэн заснаваў прыватную школу малюнка і жывапісу. Пэндзлю Ю. Пэна належаць работы «Гадзіншчык», «Стары кравец». Творчасць ураджэнца Віцебска авангардыста Марка Шагала набыла сусветную вядомасць («Над Віцебскам», «Я і вёска»).

Вядучым архітэктурным стылем першай паловы XIX ст. з’яўляўся класіцызм. Элементы яго выкарыстоўваліся пры будаўніцтве культавых будынкаў, палацаў і сядзіб, гарадскіх збудаванняў. Класічны стыль у архітэктуры адметны сіметрыяй, строгасцю і прастатой формаў, выкарыстаннем элементаў антычнай архітэктуры (порцікі, калоны, статуі і інш.).

Яскравыя прыклады беларускага класіцызму — палацава-паркавыя комплексы ў Гомелі, Валожыне, Жылічах (Кіраўскі раён), Снове (Нясвіжскі раён); Петрапаўлаўскі сабор у Гомелі, Спаса-Праабражэнская царква ў Чашніках, Свята-Міхайлаўскі сабор у Лідзе, касцёл Святога Язэпа ў Валожыне, касцёл Святой Тэрэзы ў Шчучыне; гарадскія забудовы Гомеля, Чачэрска, Навагрудка і інш.



*Чыгуначны вакзал. Г. Брэст. Адкрыты ў 1886 г.*

Адметнай рысай архітэктуры Беларусі другой паловы XIX ст. з’яўляецца эклектыка — спалучэнне розных архітэктурных стыляў. Цэрквы і саборы будаваліся пераважна ў рэтраспектыўна-рускім стылі



*Касцёл Святой Тройцы. Аг. Гервяты. 1899–1903 гг.*



*Палац Чапскіх. Аг. Прылукі. XIX ст.*

(Васкрасенскі сабор у Барысаве, Крыжаўзвіжанскі сабор у Полацку, капліца-пахавальня Паскевічаў у Гомелі); гатычныя элементы (неаготыка) выкарыстоўваліся ў касцёлах, сядзібах (Траецкі касцёл у Гервятах, сядзіба Чапскіх у Прылуках); элементы барока — у будынках тэатраў (Мінскі гарадскі тэатр, цяпер — Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы); у духу неакласіцызму ўзводзіліся гарадскія будынкі (гарадскі клуб у Віцебску, даходныя дамы ў Мінску).

Напрыканцы XIX ст. на змену эклектыцы прыходзіць мадэрн. Архітэктура мадэрну была характэрная для будынкаў новай капіталістычнай эпохі — банкаў, чыгуначных вакзалаў, гандлёвых дамоў, прамысловых прадпрыемстваў, гасцініц (дом Кастравіцкай у Мінску, банк у Магілёве, гасцініца «Савой» у Гомелі).

### Тэатр

У XIX ст. фарміруецца прафесійны беларускі тэатр. Першай беларускай операй лічыцца твор В. Дуніна-Марцінкевіча на музыку С. Манюшкі «Сялянка» («Ідылія»). У сярэдзіне XIX ст. В. Дунін-Марцінкевіч стварае першую беларускую тэатральную трупу, сам піша п'есы і выступае іх рэжысёрам.

Напачатку XX ст. папулярнасць набіраюць музычна-драматычныя гурткі, праводзяцца так званыя «беларускія вечарыны». У 1907 г. узнікае першая беларуская трупа Ігната Буйніцкага, якая гастралявала па буйных гарадах Расійскай імперыі і была досыць папулярная.

У Вільні дзейнічаў беларускі музычна-драматычны гурток пад кіраўніцтвам Алеся Бурбіса, які ўпершыню паставіў «Паўлінку» Янкі Купалы. Драма Янкі Купалы «Раскіданае гняздо» ўпершыню была пастаўлена «Першым таварыствам беларускай драмы і камедыі», якое дзейнічала ў Мінску пад кіраўніцтвам Фларыяна Ждановіча.

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ



*Будынак Мінскага гарадскога тэатра напачатку XX ст.*



*Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы. Сучасны выгляд*

Тэатр быў урачыста адкрыты ў Мінску 5 чэрвеня 1890 г. 1 мая 1917 г. артысты «Першага беларускага таварыства драмы і камедыі» паставілі на яго сцэне «Паўлінку» Янкі Купалы.

*Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, якое месца займае п’еса «Паўлінка» ў рэпертуары Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Калі тэатру нададзена імя беларускага паэта?*

*XIX — пачатак XX ст. — час падкрэсленай увагі да вывучэння мовы і культуры Беларусі, станаўлення беларусазнаўства, фарміравання беларускай літаратурнай мовы, беларускай навукі і адукацыі.*

| калі ў свеце... | на тэрыторыі Беларусі... |
|---|---|
| 1827 г. — рускі мастак Арэст Кіпрэнскі піша вядомы партрэт А. С. Пушкіна | 1828 г. — Валенцій Ваньковіч піша эцюд да партрэта А. С. Пушкіна |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Як тэхнічны прагрэс змяніў жыццё людзей у XIX — пачатку XX ст.?
2. Растлумачце, як палітычныя падзеі і навуковыя адкрыцці аказалі ўплыў на з'яўленне новых кірункаў у мастацтве і літаратуры напачатку XX ст.
3. Дакажыце, што прадстаўнікі нацыянальных меншасцей у Беларусі мелі магчымасць захоўваць і развіваць свае культурна-рэлігійныя і этнічныя рысы.
4. Ахарактарызуйце значэнне перыядычных выданняў для развіцця беларускай культуры і фарміравання нацыянальнай самасвядомасці.
5. Прывядзіце прыклады, якія дакажуць, што носьбітам народных традыцый і беларускай мовы быў народ.